# ПРЫВАТНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР І МУЗЫЧНА-ТЭАТРАЛЬНЫЯ ПРАЕКТЫ Ў СУЧАСНАЙ КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ БЕЛАРУСІ

***К. П. Яроміна,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, старшы навуковы супрацоўнік аддзела тэатральнага мастацтва Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*

Адлік існавання прыватнага музычнага тэатра на тэрыторыі Беларусі можна ўмоўна весці ад другой паловы XVIII – пачатку XIX ст. – перыяду дзейнасці магнацкіх тэатраў Радзівілаў, М. К. Агінскага, А. Тызенгаўза і інш. У першай чвэрці XIX ст. яны спынілі сваё існаванне, і ініцыятыва ў арганізацыі тэатральнай справы перайшла да антрэпрызы. На працягу XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала дастатковая колькасць адпаведных калектываў, сярод іх вызначаліся трупы пад кіраўніцтвам С. Дэшнер, М. Кажынскага, Я. Шыманскага, В. Ашпергера, В. Драздоўскага, М. Піёна, А. Даніловіча, А. Металава і іншыя, прычым многія мелі музычна-драматычную накіраванасць [1, с. 245–317].

З усталяваннем на тэрыторыі Беларусі савецкай улады і стварэннем дзяржаўных тэатраў прыватная ініцыятыва ў тэатральнай справе на доўгі час спыніла сваё існаванне і адрадзілася толькі ў канцы 1980-х гг., калі з’явілася «магчымасць новых формаў арганізацыі сцэнічных калектываў, новых спосабаў іх існавання і фінансавання» [2, с. 6], што дало штуршок узнікненню прыватных, незалежных тэатраў, а ў сярэдзіне 1990-х гг. – і антрэпрызы [5, с. 9]. Пераважная большасць новых незалежных (у сэнсе недзяржаўных) тэатраў і антрэпрыз 1980–1990-х гг. былі драматычнымі. Прыклады рэалізацыі асобных музычна-тэатральных праектаў адносяцца да пачатку – другой паловы 2000-х гг.: мюзіклы «Мэры Попінс» Рыч. Шэрмана, Роб. Шэрмана (2002) і «Папялушка» Р. Роджэрса (2003) (прадзюсарскі цэнтр «Клас-клуб Джаз Крафт» і творчы калектыў «Аўтограф») [3], супольны беларуска-расійскі праект «Прарок» І. Алейнікава і М. Дуксіна (творчая майстэрня «Арт-Цэнтр», 2007) і «Байкер» У. Кандрусевіча (прадзюсарскі цэнтр «СПАМАШ», 2008) [4, с. 248–249].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У тэатральнай прасторы Беларусі апошняга дзесяцігоддзя прыватны незалежны тэатр і тэатральныя праекты займаюць сваё адметнае месца. Як і калектывы, арганізаваныя ў 1980–1990-я гг., яны ў значнай ступені ствараюць альтэрнатыву дзяржаўнаму рэпертуарнаму тэатру, у тым ліку і праз разнастайнасць накірункаў, якія развівае прыватная ініцыятыва. Гэта не толькі драматычны тэатр, але і тэатр лялек, пластычны тэатр і тэатр танца, бэбі-тэатр і інш. Аднак пры ўсёй разнастайнасці прапановы музычны тэатр і музычна-тэатральныя праекты займаюць у «прыватным сектары» дастаткова сціплае месца.

Сярод калектываў і праектаў, якія заявілі пра сябе ў 2010-я гг., можна назваць Тэатр Генадзя Гладкова «Тэрыторыя мюзікла», Музычны дом «Класіка» і Камерны музычны тэатр «Галерэя», тэатральную кампанію MusicLand. Музычны дом «Класіка» (заснавальнік А. Чахоўскі) існуе з 2012 г., асноўным накірункам яго дзейнасці стала арганізацыя канцэртаў класічнай музыкі, тэатралізаваных музычных праграм. Разам з тэатрам «Галерэя» «Класіка» ажыццявіла пастаноўку камернай оперы С. Манюшкі «Verbum Nobile» (рэж. А. Медзякова, 2013) і оперы-пасцічыа «Опера ў піжаме» (рэж. Э. Мартынюк, 2017). Тэатр «Галерэя» арганізаваны ў 2011 г. і акрамя ўзгаданых супольных з «Класікай» праектаў зрабіў пастаноўку оперы-пасцічыа «Фантазіі Вольфганга Амадэя» (рэж. А. Медзякова, 2012) і некалькіх спектакляў-канцэртаў. Тэатральнымі праектамі займаецца кампанія MusicLand, арганізаваная ў 2019 г. (прадзюсары і кіраўнікі В. Нікалаеўская і А. Грэковіч). У пастаноўцы мюзікла-казкі «Дзінь-дон, я ваша мама!» (рэж. Д. Мядзель, 2019) паводле матываў кіназказкі «Мама» 1976 г. задзейнічаны прафесійныя акцёры мінскіх тэатраў і выхаванцы тэатра эстраднай песні «Сябрынка». Ёсць у тэатра і некалькі канцэртных праграм. Галоўным прадстаўніком прыватнага музычнага тэатра ў сучаснай Беларусі з’яўляецца «Тэрыторыя мюзікла» (далей – ТМ). Тэатр заснаваны ў 2012 г. рэжысёрам Н. Грыненка і акцёрам, харэографам Д. Якубовічам і ўяўляе сабой калектыў са сталым рэпертуарам, пастановачнай камандай, больш-менш стабільнай трупай прафесійных акцёраў. Пры адсутнасці ўласнай пляцоўкі ТМ ажыццяўляе паказы спектакляў галоўным чынам на сцэне Рэспубліканскага палаца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры прафсаюзаў, гастралюе па Беларусі, Расіі, Літве, Латвіі. Тэатр асвойвае і адукацыйны накірунак дзейнасці: з 2018 г. на базе гімназіі-каледжа мастацтваў імя І. Ахрэмчыка працуе дзіцячая студыя ТМ. Усе спектаклі тэатра ажыццёўлены адной пастановачнай групай: рэжысёрка Н. Грыненка, харэограф Д. Якубовіч, сцэнограф А. Меранкоў, мастачкі па касцюмах Ю. Бабаева і Т. Лісавенка, таму можна казаць нават аб пэўным стылі, уласцівым спектаклям ТМ.

У стварэнні і дзейнасці ТМ значную ролю адыграла падтрымка кампазітара Г. Гладкова, а мэтай арганізацыі быў заяўлены «эксперымент у рамках жанру і пашырэнне саміх рамак жанру мюзікл» [3]. Гэта абумовіла асаблівасці рэпертуару ТМ, у якім можна знайсці мюзікл-вадэвіль «Сватанне гусара» (2013), мюзікл-аперэту «Сабака на сене» (2014), мюзіклмістыфікацыю «12 крэслаў» (2015), блазанскі рок-мюзікл «Жарсці па Тылі» (2017), стэндап-мюзікл «Кішэнны тэатр» (2019) (на аснове драматургіі Ж. Както з музыкай Дж. Ларсана, М. Йестана, Д. Браўна і інш.). Доўгі час ТМ працаваў выключна з музыкай Г. Гладкова, прычым не толькі з адмысловымі музычна-тэатральнымі творамі, асобныя з якіх (мюзікл «Блакітнае шчаня», 2016) былі напісаны спецыяльна для калектыву, але і з музычным матэрыялам, створаным для драматычных спектакляў. З развіццём тэатра яго рэпертуарная палітыка карэктавалася: акрамя спектакляў для дарослых і дзяцей з музыкай Г. Гладкова ў афішы з’явіліся ліцэнзійны брадвейскі рок-мюзікл «Непадалёк ад нормы» (музыка Т. Кітта, п’еса і вершы Б. Йоркі, пераклад Н. Грыненка і А. Грыненкі, 2018), дзіцячыя навагоднія спектаклі з лібрэта Н. Марчук і музыкай беларускіх кампазітараў А. Атрашкевіч («Цётухна Прастуда і чарадзейны гадзіннік», 2016) і І. Палякова («Навагодняя бітва магаў», 2019), вялікая колькасць тэматычных тэатралізаваных канцэртных праграм, пераважна прымеркаваных да папулярных святаў. Апошнія два накірункі можна ў пэўнай ступені разглядаць як камерцыйныя праекты.

Прыцягнуць увагу гледача да маладога тэатра павінен быў зварот калектыву да назваў, знаёмых патэнцыяльнай аўдыторыі па савецкіх музычных кінастужках («Сватанне гусара», «12 крэслаў», «Звычайны цуд») з вядомымі хітамі Г. Гладкова. Аднак пастаноўкі ТМ нельга назваць тэатральнымі рэплікамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адпаведных кіна- ці анімацыйных фільмаў – гэта самастойныя мастацкія творы. Агульным для большасці спектакляў з'яўляецца карпатлівая работа з музычным і драматургічным матэрыялам (скарачэнне ці пашырэнне арыгінальнай партытуры, стварэнне новых аранжыровак, рэдакцыі п'есы і інш.), імкненне надаць спектаклю актуальнае, сучаснае гучанне. Гэта дасягаецца праз мастацкае вырашэнне касцюмаў, выкарыстанне асобных рэжысёрскіх прыёмаў, прыўнясенне ў пастаноўку пазнавальных прыкмет часу (рэквізіт, інтэрпрэтацыя вобразаў персанажаў, іх рэплікі). У «Жарсцях па Тылі» мастачка Т. Лісавенка ў касцюмах спалучыла сілуэты і асобныя элементы гістарычных убранняў XVI ст. з сучаснымі, а характар сцэнічных strojaў Ю. Бабаевай да мюзікла «Звычайны цуд» вызначыў стыль стымпанк. Спектакль «Сватанне гусара» праз зварот да прыёму «тэатра ў тэатры» вырашаўся як «гульня ў вадэвіль», крыху іранічная і насмешлівая. Іграву прыроду пастаноўкі падкрэслівала спалучэнне ў касцюмах элементаў строяў XIX ст. і сучаснага адзення акцёраў (мастачка Т. Лісавенка), умоўнае, лубочнае мастацкае афармленне. Пазнавальнымі прыкметамі часу ў «12 крэслах» стала выкарыстанне смартфонаў (дзеянне пачынаецца як экскурсія ў музеі мэблі), іранічна асэнсаванага вобраза Канчыты Вурст, а ў «антыгламурным мюзікле» «Блакітнае шчаня» выразна прагучала тэма апантанасці знешнасцю, модай, паспяховасцю і падманлівасці гэтых арыенціраў.

Бадай, самым выразным эксперыментальным і рызыкоўным можна назваць зварот ТМ да пастаноўкі «Жарсцей па Тылі», «Кішэннага тэатра» і «Непадалёк ад нормы». Апошняя работа займае выключнае месца сярод спектакляў тэатра. Пастаноўка гэтага мюзікла, лаўрэата прэміі «Тоні» і Пулітцэраўскай прэміі, пашырыла ўяўленне аб эстэтыцы, музычнай мове сучаснага мюзікла, праблематыцы, да якой ён звяртаецца, закранаючы тэмы псіхалагічнага здароўя, жыцця чалавека, які пакутуе на псіхічнае захворванне, уплыву хваробы на яго блізкіх.

Раз гаворка ідзе пра музычныя праекты і тэатр, які ажыццяўляе пастаноўку мюзіклаў і эстэтыка якіх традыцыйна мае на ўвазе «звышразмах, звышраскошу атрыбутыкі і сцэнаграфіі» [6, с. 168], неабходна звярнуцца да асаблівасцяў мастацкага афармлення спектакляў ТМ і работы з музычным складнікам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Агульным для пастановак, перадусім для дарослых, з'яўляецца лаканізм сцэнаграфічнага вырашэння, які можа тлумачыцца, з аднаго боку, мастацкай індывідуальнасцю сцэнографа А. Меранкова, а з іншага – фінансавымі прычынамі і гастрольнай дзейнасцю тэатра. У большасці выпадкаў аснову сцэнаграфіі складаюць рухомыя ўмоўныя канструкцыі ці лаканічныя дэкарацыі, якія сімвалічна абазначаюць месца дзеяння або ствараюць адпаведны мастацкі вобраз. Стрыманасць дэкарацыйнай часткі звычайна кампенсуецца выразнымі дыхтоўнымі касцюмамі, якія выконваюць ролю каларыстычнага акцэнту ў нярэдка манахромным афармленні, маркіруюць час і месца дзеяння. Такі ж лаканізм афармлення, аднак з акцэнтам на выкарыстанне відэяпраекцый, якія дынамізавалі візуальны рад пастаноўкі, насычалі яе колерам і святлом, у сукупнасці са стварэннем пазнавальных, выразных вобразаў персанажаў з дапамогай яркіх касцюмаў, парыкоў, грыму, блізкіх да стылю анімэ, вызначаў і сцэнаграфічнае вырашэнне спектакля «Дзінь-дон, я ваша мама!» (мастак А. Жыгур) тэатральнай кампаніі MusicLand. Максімальны лаканізм мастацкага афармлення ўласцівы і пастаноўцы оперы «Verbum Nobile».

Што да музычнага складніка спектакляў ТМ, то ўсе яны ідуць пад фанаграму. Гэта ж адносіцца да праектаў кампаніі MusicLand. Адзінае выключэнне – пастаноўка «Непадалёк ад нормы», дзе акрамя фанаграмы гучала музыка ў жывым выкананні рок-групы (яна падчас спектакля знаходзілася на сцэне). Оперныя спектаклі «Класікі» і «Галерэі», дзейнасць якіх скіравана ў асноўным на арганізацыю музычных канцэртаў, ішлі з жывым аркестрам (музычным суправаджэннем). Адзначаныя асаблівасці (адсутнасць жывога аркестра, шыкоўнай сцэнаграфіі) не змяншаюць каштоўнасці існавання і дзейнасці разгледжаных калектываў і праектаў.

Незалежныя калектывы і іх праекты ствараюць пэўную альтэрнатыву дзяржаўным музычным тэатрам у плане рэпертуарнай прапановы, бо не дублююць назвы, якія можна сустрэць у афішах апошніх. Аднак нельга казаць, што эстэтыка ці праблемна-тэматычнае поле пастановак незалежных тэатраў і праектаў кардынальна адрозніваецца ад прапановы дзяржаўных сцэн. За рэдкім выключэннем («Непадалёк ад нормы», у пэўнай ступені «Жарсці па Тылі») у афішах незалежных калек-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

тываў дамінуюць лірычныя і лірычна-камедыйныя творы. Разам з тым прыватная ініцыятыва спрыяе пашырэнню ўяўленняў гледачоў пра музычны тэатр, уводзіць у поле сучаснай беларускай тэатральнай культуры якасныя музычна-тэатральныя творы, прычым не толькі замежных аўтараў, але і тыя, што гістарычна з'яўляюцца яе часткай, дае магчымасці для развіцця і самарэалізацыі акцёраў, рэжысёраў, мастакоў.


1. *Капилов, А. Л.* Музыкальный театр Белоруссии XIX – начала XX в. / А. Л. Капилов // Музыкальный театр Беларуси. Дооктябрьский период. – Минск : Наука и техника, 1990. – С. 245–352.

2. *Михеева, О. Н.* Альтернативный театр и другие... / О. Н. Михеева. – Минск : Ковчег, 2005. – 88 с.

3. Сайт театра «Территория мюзикла» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://musicals.by. – Дата доступа: 17.03.2021.

4. *Стельмах, А. М.* Антреприза в структуре современной театральной жизни Беларуси / А. М. Стельмах // Культура: открытый формат – 2013 : сб. науч. ст. / БГУКИ. – Минск, 2013. – С. 246–251.

5. *Стэльмах, Г. М.* Стан і тэндэнцыі развіцця антрэпрызы ў Беларусі канца XX – пачатку XXI стагоддзя : аўтарэф. дыс. … канд. мастацтвазнаўства : 17.00.09 / Г. М. Стэльмах ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2014. – 24 с.

6. *Ювченко, Н. А.* Музыка в драматическом театре Беларуси: XX – начало XXI века / Н. А. Ювченко. – Минск : Белорус. наука, 2007. – 270 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ